ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

5 СТУДЗЕНЯ 2017 г.
ЧАЦВЕР
№ 1 (15808)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Артур МАЦВЕЕНКА:

# «У маёй працы карысны нават малаток»


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Музыка ў фільмах і гульнях — неад'емны складнік. Пагадзіцеся, без мелодый, песень кіно было б вельмі сумна глядзець, а без эпічнай музыкі — блукаць бясконцымі сцежкамі камп'ютарных гульняў. Сённяшні наш суразмоўца, кампазітар, аўтар музычнага праекта Dzivia Артур Мацвеенка дакладна ведае, як скласці гукавы «партрэт» героя гульні, які саўндтрэк напісаць для кіно ці рэкламнага роліка. І дзеля патрэбных мелодый ён не баіцца нават правесці ноч у лесе. Некаторыя сакрэты сваёй незвычайнай прафесіі Артур раскрывае ў гутарцы з карэспандэнтам «Чырвонкі. Чырвонай змены».**

***— Прафесія кампазітара цяпер досыць рэдкая. Тым больш — сярод моладзі. Чаму ты выбраў для сябе такі шлях?***

— Усё пачалося выпадкова, аднойчы проста пачаў пісаць музыку. Натуральна, я маю адукацыю: скончыў музычную школу па класе кларнета і саксафона. Але пасля яе заканчэння я гады тры не іграў на інструменце, а потым у пэўны момант пачаў ствараць музыку. Сапраўды, наша прафесія досыць рэдкая, але, можна сказаць, запатрабаваная на міжнародным рынку. Магчыма, прычына такой нераспаўсюджанасці кампазітарскай справы ў тым, што ў Беларусі няма навучальных устаноў, дзе даюць патрэбную адукацыю. Я маю на ўвазе — навучаюць кампазітараў, якія пішуць неакадэмічную музыку для фільмаў і гульняў. Так, у нас ёсць акадэмія музыкі, але там выкладаюць зусім іншае. Мне ж трэба ведаць фізіку гуку, умець карыстацца эквалайзерамі, кампрэсарамі. Гэта ўсё даецца далёка не адразу.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Цёплае месца

# МІЛЬЁН ПУНСОВЫХ РУЖ,

## або Каго не здзівіш гэтай кветкай

**Нават самай глыбокай зімой, у самыя моцныя маразы ў вёсцы Багатырова, што пад Мінскам, ёсць месца, дзе клімат заўсёды блізкі да субтрапічнага. І справа зусім не ў надвор'і — менавіта тут супрацоўнікі агракамбіната «Ждановічы» вырошчваюць ружы для ўсёй краіны. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» наведалі незвычайную вытворчасць і пазнаёміліся з маладымі работніцамі цяплічнага камбіната «Багатырова».**

У складзе комплексу знаходзіцца адразу некалькі цяпліц: у большасці вырошчваюць агародніну, пераважна агуркі і таматы. Пад кветкі тут адведзена толькі адно памяшканне, але плошча яго ўражвае: больш як два гектары. Палову займае самы папулярны сорт — чырвоная ружа Red Naomi, астатняе падзелена паміж яшчэ адзінаццацю сартамі кветкі. Гэта, напрыклад, White Naomi белага колеру, Sweet Avalanche ружовага, Peach Avalanche персікавага — усяго больш за 150 тысяч кустоў.

**Майстар брыгады №5 Дзіяна ГРЫШКІНА** родам з Мінска, пасля школы паступіла ў каледж бізнесу і права, дзе атрымлівала адукацыю эканаміста. Упершыню ў агракамбінат прыйшла яшчэ ў 18 гадоў — праходзіць практыку. Спачатку працавала на базе, потым займалася ўлікам прадукцыі на адным са складоў, а ў 2014-м перайшла ў наваствораны цяплічны камбінат. Работа за межамі кальцавой праблемы не стварыла — усіх супрацоўнікаў прывозяць сюды і развозяць па дамах у аўтобусе.

— У мае абавязкі ўваходзіць налічэнне заработнай платы, таму я пераважна сачу за аб'ёмамі працы, якую выконваюць спецыялісты брыгады, а таксама кантралюю яе якасць, — дзеліцца спецыяліст. — Заработная плата ва ўсіх здзельная, таму яе памер цалкам залежыць ад таго, як чалавек працаваў. Налічваю заробак таксама я, так бы мовіць, майстар і бухгалтар у адной асобе. Хоць непасрэдна з кветкамі не працую, але пра тэхналогію вырошчвання руж ведаю ці не ўсё.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Дзіяна Грышкіна кантралюе работу ўсёй брыгады цяплічнага камбіната.

Сваім розумам

# Настаўнік і вучань: што ў ідэале?

## Чаму гісторыя і літаратура — не лішнія прадметы ў школе



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**«Школа будучыні вачыма навучэнцаў» — дэбаты на гэту тэму прайшлі ў Нацыянальным інстытуце адукацыі з удзелам адзінаццацікласнікаў 43-й сталічнай гімназіі. У цэнтры ўвагі аказаліся плюсы і мінусы сучаснай школы. Без пяці хвілін выпускнікі разважалі пра тое, якімі павінны быць ідэальны настаўнік і ідэальны вучань, ці ёсць будучыня ў кніг на папяровых носьбітах і ў якую школу яны б хацелі прывесці сваё дзіця.**

**— Нам падалося цікавым запрасіць да дыскусіі менавіта юнакоў і дзяўчат, якім засталося ўсяго паўгода да самастойнага дарослага жыцця, бо гэта ўжо людзі з крытычным мысленнем і сваёй пазіцыяй, якую яны могуць аргументаваць і гатовы яе адстойваць, — растлумачыў выкладчык Інстытута журналістыкі БДУ кандыдат філалагічных навук дацэнт Уладзімір КАПЦАЎ.**

### ІНСТРУМЕНТ ДЛЯ ВЫХАВАННЯ

— Самы вялікі мінус нашай школы — гэта яе вучэбная праграма, якая вельмі павярхоўна закранае змест вялікай колькасці вучэбных дысцыплін, прычым тыя веды, што мы атрымліваем на школьных уроках, магчыма, у будучыні нам увогуле не спатрэбяцца.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*